Назаўсёды ў памяці вернікаў

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
12.11.2017 00:00



Лістапад – асаблівы месяц малітвы за памерлых. Ён мабілізуе вернікаў штодзённа ўзгадваць перад Богам аб тых, хто пераступіў ці пераступае “парог надзеі”. Хрысціянская памяць пра памерлых – гэта значна больш, чым толькі праяўленне людской зычлівасці да іх. Яна вырастае на фундаменце веры ў вечнае жыццё, несмяротнасць чалавечай душы і паўсюдны заклік да жыцця ў хвале ўваскрасення. У гэты час узгадваем у малітве таксама памерлых святароў, якіх мы ведалі і якія не шкадавалі свайго часу, сіл і ўменняў, каб служыць Богу, Касцёлу і людзям, да каторых былі пасланы. За свайго шматгадовага пробашча кс. Іпаліта Ядкоўскага ў 50-ую гадавіну яго смерці маліліся вернікі парафіі св. Яна Хрысціцеля ў Воўпе. Святар прыбыў на месца паслугі ў 1916 годзе і аддана служыў там да моманту спачыну 24 кастрычніка 1967 года. Хоць з таго часу мінула столькі гадоў, памяць пра памерлага душпастыра надалей жыве ў сэрцах людзей. Старэйшае пакаленне ўсё яшчэ памятае яго словы і ўчынкі, прасякнутыя вялікай любоўю да Бога і клопатам пра Хрыстовы Касцёл ды душы вернікаў.
†

Святар малітвы




Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
12.11.2017 00:00

Антоній Вішнеўскі, які пачаў працаваць арганістам у мясцовай парафіі яшчэ пры жыцці кс. Іпаліта і працягвае сваю паслугу па сённяшні дзень, памятае душпастыра як Чалавека з вялікай літары, цалкам адданага ўласнаму пакліканню. Менавіта дзякуючы намаганням пробашча ў касцёле з'явіўся арган. "Гэта быў вельмі набожны святар. Ён меў асаблівае замілаванне да ружанцовай малітвы, якую часта адгаворваў і да якой заахвочваў іншых. Сваім прыкладам сціплага жыцця паказваў нам дарогу, якой трэба крочыць, каб ніколі не расчаравацца", – расказвае мужчына.

Спадар Антоній прыгадвае, што "з амбона ксёндз прамаўляў вельмі доўга і дакладна, а яго казанні заўсёды былі прасякнуты верай і духам. Мы слухалі свайго пастыра затаіўшы дыханне, бо ў яго заўсёды было штосьці важнае, каб перадаць нам".

Святар чалавека



Вернікі да сёння памятаюць, што душпастырскія абавязкі кс. Іпаліт заўсёды выконваў сумленна. Калі трэба было падрыхтаваць кандыдатаў да сакраманту сужэнства, запрашаў іх да сябе ў плябанію і знаёміў з галоўнымі праўдамі хрысціянскай веры, гаварыў пра абавязкі і вынікі, якія паўстаюць пасля заснавання сям'і. Яніна Банцэвіч расказвае, што кс. Іпаліт удзяліў сакрамант шлюбу яе бацькам, ахрысціў яе саму і 3-іх братоў, а таксама асісціраваў пры заключэнні яе ўласнага сужэнства.

"Перад шлюбам мы з нарачоным тройчы былі ў кс. Ядкоўскага. Я да канца жыцця буду памятаць словы, якія ён тады сказаў нам: «Вы засноўваеце сям'ю, таму памятайце, што ніколі нельга забывацца аб перадачы веры. Вучыце гэтаму сваіх дзяцей і ўнукаў, вядзіце іх да Бога»", – гаворыць жанчына. Спадарыня Яніна адзначае, што святару было вельмі важна, каб новае пакаленне вернікаў, нягледзячы на вялікае супрацьстаянне і пераслед, узрастала ў веры сваіх продкаў.

Святар мучанік

Назаўсёды ў памяці вернікаў

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
12.11.2017 00:00

